2. Берн, Эрик. Игры, в которые играют люди; Люди, которые играют в игры / Эрик Берн; [пер. с англ. А. Грузберга]. – Москва: Эксмо, 2020. – 592 с.
3. Левин, Курт. Теория поля в социальных науках / Курт Левин. - М.: Академический проект, 2017. - 313 с.
4. Фрейд, Зигмунд. Психоаналитические этюды / Зигмунд Фрейд. Составление Д.И. Донского, В.Ф. Круглянского; Послесл. В.Т. Кондрашенко. - Мн.: Беларусь, 1991. - 606 с.

УДК 373.5. 016:811.161.3

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕКТРОННЫХ СРОДКАЎ НАВУЧАННЯ З МЭТАЙ АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**А. І. Роман**
ДУА “Сярэдняя школа № 28 г. Гродна” (Рэспубліка Беларусь, 230005, г. Гродно, вул. Брыкеля,11;e-mail:school28@mail.grodno.by)

Анатацыя. Артыкул прысвечаны эфектыўнасці выкарыстання электронных сродкаў навучання з мэтай актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. У ім разглядаецца, якім чынам ЭСН актывізуюць дзейнасць навучэнцаў, якія агульнавучэбныя ўменні і навыкі яны развіваюць, на якіх этапах урока выкарыстоўваюцца.
Ключавыя словы: электронныя сродк інавучання, пазнавальная дзейнасць, агульнавучэбныя ўменні і навыкі.

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ЭЛЕКТРОННЫХ СРЕДСТВ ОБУЧЕНИЯ С ЦЕЛЬЮ АКТИВИЗАЦИИ ПОЗНАВАТЕЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ НА УРОКАХ БЕЛОРУССКОГО ЯЗЫКА И ЛИТЕРАТУРЫ

**А. И. Роман**
ГУО «Средняя школа №28 г. Гродно» (Республика Беларусь, 230005, г. Гродно, ул. Брикеля, 11; e-mail: school28@mail.grodno.by)

Аннотация. Статья посвящена эффективности использования электронных средств обучения з целью активизации познавательной деятельности учащихся. В ней рассматривается, каким образом ЭСО активизируют деятельность учащихся, какие общеучебные умения и навыки они развивают, на каких этапах урока используются.
Ключевые слова: электронные средства обучения, познавательная активность, общеучебные умения и навыки.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

# THE USAGEOF ELECTRONIK LEARNING TOOLS IN ORDER TO ACTIVATE THECOGNITIVE STUDENTS'ACTIVITY AT BELARUSIAN LANGUAGE AND LITERATURE LESSONS.

**A.I. Roman**
State educational establishment "School28 Grodno" (Belarus, 230005, Grodno, 11 Brikelya st.; e-mail: school28@mail.grodno.by)

Summary. The article is devoted to the effectiveness of using electronic learning tools in order to activate the cognitive activity of students. It examines how electronic learning tools activate students ' activities , what general educational skills they develop, and at what stages of the lesson they are used.
Key words: lectronic learning tools, cognitive activities, general educational skills.

Рэчаіснасцьнашых навучэнцаў - сувязь праз электронную пошту, знаёмствы і стасункі ў сацыяльных сетках, камп'ютарныя гульні і "далучэнне да найноўшых ведаў па-за межамі школы,найперш праз інтэрнэт" [3]. Ва ўмовах такой актыўнай інфарматызацыі, медыядаступнасці ўзнікае неабходнасць навучыць дзяцей крытычна ўспрымаць інфармацыю, умець яе аналізаваць,выбіраць самае істотнае, выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю ў навучальнай дзейнасці. Станоўчыя вынікі магчымы толькі пры наяўнасці ў навучэнцаў унутранай матывацыі, зацікаўленасці працэсам навучання.

Глыбока і змястоўна праблему развіцця пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў разглядаюцьМ. В. Кухараў, які лічыць асноўным у навучанні ўдасканаленне спосабаў дзейнасці навучэнцаў [2], іпрафесар М. І. Запрудскі, які сцвярджае, што пазнавальную актыўнасць навучэнцаў забяспечваюць іх унутраныя матывы [1].

Электронныя сродкі навучання (ЭСН) з'яўляюцца эфектыўным сродкам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.Абгэтым сведчаць даследаванні Т.І.Шамавай [5] і прафесара Г. К. Селяўко [4].

На ўроках беларускай мовы і літаратуры плённым з'яўляецца выкарыстанне наступных ЭСН:

-электронны адукацыйны рэсурс (http://e-vedy.adu.by/)

-аўтарскі навучальны сайт "Вывучаем родную мову і літаратуру"(https://clck.ru/M8cac)

- відэасюжэты YouTube;
- праграма для падрыхтоўкі прэзентацый PowerPoint;
- сервіс LearningApps;
- праграма для інтэрактыўнай дошкі SMARTNotebook;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

- Google- формы;
- медыяпрадукты, створаныя вучнямі (відэасюжэты, буктрэйлеры).

Эфектыўнай з’яўляецца праца з праграмамі SMARTNotebook, PowerPointі сервісам LearningApps. Іх выкарыстанне не мае ўзроставых абмежаванняў. Дадзеныя сродкі дапасуюцца да выкарыстання на розных этапах урока.Прэзентацыі ў праграме PowerPoint з’яўляюцца сродкам тлумачэння новай тэмы. Практыкаванні, падрыхтаваныя ў сервісе LearningApps, мэтазгодна выкарыстоўваць для актуалізацыі ведаў, уменняў і навыкаў, замацавання пройдзенага матэрыялу ікантролю ўзроўню ведаў.

Вучні 5-7 класаў- карыстальнікі дыдактычных матэрыялаў,створаных з дапамогай ЭСН. Але іх выкарыстанне дазваляе зрабіць урок дынамічным, насычаным рознымі прыёмамі і формамі работы, што спрыяе актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Вучні 8-11 класаў могуць ствараць дыдыктычныя матэрыялы, што фарміруе ў іх уменні аналізаваць інфармацыю, выбірацьпатрэбны матэрыял, спалучаць інфармацыю на слайдзе з тэкстам выступлення,калі гэтапрэзентацыя, абопатрабуе высокага ўзроўню авалодвання ведамі, каб правільна дапасаваць пытанні і адказы ў заданнях LearningApps.

Магчымасці праграмы SMARTNotebook складана пераацаніць.

Праграма падыходзіць для інтэрактыўных дошак розных тыпаў. Дыдактычныя матэрыялыможна выкарыстоўваць на ўсіх этапах урока,узроставыя абмежаванніадсутнічаюць.Эфектыўнымі з’яўляюцца наступныя прыёмы: “зацямненне экрана” (“шторка”), “колерам фона”, “перамяшчэнне”, “чарадзейная ячэйка”

З Google-формамі мае сэнс работа з вучнямі 8-11 класаў. Навучэнцы гэтай узроставай групы маюць дастатковы вопыт работы з камп’ютарам і мабільным тэлефонам,што неабходна для выканання тэстаў у Google-формах. Выкарыстанне гэтага ЭСН дазваляе якасна і хутка ажыццяўляць кантроль узроўню ведаў і ўменняў для навучэнцаў работа з Google-формамі з’яўляецца эфектыўным трэнінгам па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання (https://clck.ru/M8cac).

Медыяпрадукты, створаныя навучэнцамі, - плённы сродак актывізацыііх дзейнасці напрыклад, стварэнне буктрэйлераў, якія не проста “рэкламуюць” творы, а з’яўляюцца творчымі заданнямі да іх, што забяспечвае актыўную дзейнасць усіх навучэнцаў.Так, да твора У.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Караткевіча "Паром на бурнай рацэ"(8 клас) навучэнцы атрымалі заданне агучыць відэасюжэт, выкарыстаўшы тры цытаты з твора. Буктрэйлер да аповесці В. Быкава "Жураўліны крык" (8 клас) стаў адначасова літаратурным відэадыктантам.

Такая форма работы спрыяе развіццю творчых здольнасцей вучняў, удасканальвае ўменні аналізаваць мастацкі твор, развівае асацыятыўнае мысленне, павышае цікавасць да вывучаемых твораў, стварае сітуацыю поспеху, як іпраца з відэазапісамі выразнага чытання вершаў навучэнцамі (https://clck.ru/M8cac).

Такім чынам, электронныя сродкі навучання спрыяюць матывацыі навучання, актывізуюць пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, даюць магчымасць суб'ектам адукацыйнага працэсу актыўна ўзаемадзейнічаць, ствараюць умовы для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў, фарміруюць уменні працаваць з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі, дазваляюць эфектыўна ажыццяўляць кантроль і ацэнку ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-3 : Пособие для учителей. – 2-е изд. / Н. И. Запрудский. – Минск, 2017. – 288с.
2.Кухарев, Н.В. Диагностика познавательных интересов и умственной самостоятельности учащихся / Н.В.Кухарев. – Мозырь: Белый ветер,1998. – 99с.
3. Ляшук, В. Я. Да пытання аб перспектыўных прыёмах, метадах, тэхналогіях выкладання літаратуры / В. Я. Ляшук // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – №12. – С.3-5.
4. Селевко, Г.К. Энциклопедия образовательных технологий, т.1 / Г.К. Селевко // М.: НИИ школьных технологий. - 2006.
5. Шамова, Т.И. Активизация обучения школьников / Т. И. Шамова. – Москва: Педагогика, 1982. – 209 с.

УДК 378.091

## ОБУЧЕНИЕ ОНЛАЙН: ЗА И ПРОТИВ

**Ю. А. Романченко**
Полтавская государственная аграрная академия (Украина, 36003, г. Полтава, ул. Сковороды 1/3; e-mail: yulia1001@ukr.net)

Аннотация. Определена сущность обучения онлайн Обосновано необходимость данного метода для повышения эффективности учетного процесса в высшей школе. Описано преимущества и недостатки онлайн обучения.

Ключевые слова: онлайн обучение, модератор, преподаватель, студент, платформа Moodle, традиционная аудитория, тьютор.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ